*УДК 378.147:81*

# АСАБЛІВАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ФІЛАЛАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ ЎРОКАЎ ТВОРЧЫХ РАБОТ (МЕТОДЫКА СІСТЭМЫ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ)

**А. М. Макарэвіч**

*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова,*
*вул. Касманаўтаў, 1, 212022, Беларусь, olekmak@mail.ru*

Характарызуюцца асаблівасці падрыхтоўкі студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей да правядзення ўрокаў творчых работ па сістэме перспектыўных ліній. Пры гэтым улічваецца змена колькасці навучальных і кантрольных творчых работ у 2022/2023 навучальным годзе, а таксама дапаўненні да прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання ўрокаў беларускай літаратуры. Мэта даследавання: вызначэнне этапаў, форм і зместу метадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў беларускай літаратуры да працэсу фарміравання ў навучэнцаў установаў агульнай сярэдняй адукацыі ўменняў выканання творчых работ. Навізна дадзенай публікацыі: а) прапаноўваюцца новыя падыходы да планавання і падрыхтоўкі ўрокаў творчых работ па беларускай літаратуры; б) акрэсліваюцца прынцыпы падбору тэматыкі творчых работ; в) вызначаюцца этапы сістэмнай падрыхтоўкі навучэнцаў да падрыхтоўкі і выканання творчых работ; г) прапаноўваюцца формы метадычнага планавання студэнтамі падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў творчых работ па беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

***Ключавыя словы:*** сістэма перспектыўных ліній; творчыя работы навучэнцаў.

# PREPARING PHILOLOGY STUDENTS FOR LESSONS OF CREATIVE WRITING (THE METHOD OF PERSPECTIVE LINES)

**A. N. Makarevich**

*Mogilev State A. Kuleshov University,*
*Kosmonavt St., 1,212022, Belarus, olekmak@mail.ru*

The features of preparing students of Philology for conducting lessons of creative writing according to the system of perspective lines are characterized. The author takes into account the change in the number of academic and examination creative works in the 2022/23 academic year, as well as the additions to the approximate calendar and thematic planning in the course of Belarusian Literature. The purpose of the study is to determine the stages, forms and content of the academic course for future teachers of Belarusian literature in order to help them to develop creative skills of secondary school children. The novelty of the publication is determined by the following: a) new approaches to planning and

preparing lessons of creative writing in the course «Belarusian Literature» are offered; b) the selection crtiteria for choosing topics of creative works are suggested; c) the stages of student systematic preparation for lessons of creative writing are defined; d) the forms of student planning for the preparation and conduct of lessons of creative writing in the course «Belarusian Literature» in institutions of general secondary education are proposed.

***Key words:*** system of perspective lines; students' creative work.

Сістэма перспектыўных ліній (далей – СПЛ) у кантэксце методыкі выкладання літаратуры прадугледжвае не толькі вывучэнне тэарэтычных пытанняў, а і фарміраванне ў студэнтаў практычных кампетэнцый, якія маюць наступную вектарную скіраванасць – рацыянальнае мадэляванне: а) розных напрамкаў дзейнасці студэнта-практыканта; б) прафесійнай дзейнасці настаўніка літаратуры; в) розных відаў самастойнай працы навучэнцаў агульнай сярэдняй адукацыі (далей – навучэнцаў) па СПЛ.

Суб’ектнасць настаўніка літаратуры прадугледжвае, акрамя іншага, усведамленне, улік, планаванне бліжэйшых, сярэдніх і дальніх перспектыў у працэсе арганізацыі і здзяйснення вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці па прадмеце. Гэта дазваляе больш рацыянальна, з элементамі метадычнага, навучальнага, вучэбнага прырашчэння наладжваць тыя ці іншыя прынцыпы, віды і формы дзейнасці настаўніка і навучэнцаў, не паўтараючы некаторыя этапы гэтай дзейнасці, вызваляючы пры гэтым час і адпаведны запас энергіі – разумовай, фізічнай – на здзяйсненне планаў творчага характару. Рацыянальна арганізаваная інтэлектуальная дзейнасць спрыяе набыванню і прымнажэнню не толькі фактычнай інфармацыі пэўнага кшталту, паступальнаму фарміраванню ўменняў і навыкаў адпаведнай скіраванасці, а і спрыяе ўзнікненню ў суб’екта такой дзейнасці ўпэўненасці ў сваіх сілах, жадання творчага прымянення атрыманых ведаў і сфарміраваных навыкаў.

Прыведзеныя вышэй тэарэтычныя палажэнні тычацца такой праблемнай сферы прафесійнай адукацыі будучага настаўніка літаратуры, як планаванне, арганізацыя і правядзенне ўрокаў творчых работ (далей – УТР), а таксама падрыхтоўка навучэнцаў да выканання творчых работ (далей – сачыненняў). Сутнасць гэтай праблемнай сферы ў наступным:

а) недастатковая колькасць вучэбных гадзін на падрыхтоўку студэнтаў, скіраваную на працу па фарміраванню ў навучэнцаў, ведаў, уменняў і навыкаў для выканання творчых работ;

б) павелічэнне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з 2022/2023 н. г. колькасці творчых навучальных і кантрольных сачыненняў пры ранейшай колькасці гадзін на вывучэнне беларускай (рускай) літаратуры і беларускай (рускай) моў; напрыклад, для V класа (базавы ўзровень) вызначана 5 навучальных сачыненняў (3 па беларускай мове і 2 па беларус-

кай літаратуры), для X і XI класаў, адпаведна, па 9 творчых работ (2 кантрольныя і 3 навучальныя сачыненні па беларускай мове і 2 кантрольныя і 2 навучальныя па беларускай літаратуры); тут варта звярнуць увагу на тое, што такая ж колькасць сачыненняў вызначана па рускай мове і літаратуры; у сувязі з гэтым паўстае праблема рацыянальнай арганізацыі працэсу падрыхтоўкі навучэнцамі тэкстаў творчых работ;

в) недастатковасць вучэбнага часу на эфектыўную падрыхтоўку навучэнцаў да напісання вызначанай колькасці сачыненняў па розных тэмах.

Адно з магчымых выйсцяў з поля такой праблемнасці – выкарыстанне методыкі СПЛ у наступнай яе вектарнай скіраванасці:

а) засваенне алгарытмаў тэарэтычнай і практычнай *рацыянальнай на перспектыву* дзейнасці настаўніка па арганізацыі творчай дзейнасці навучэнцаў;

б) фарміраванне ўменняў і навыкаў *рацыянальнай, на перспектыву якаснага іх прырашчэння* арганізацыі самастойнай працы навучэнцаў па падрыхтоўцы творчых работ.

У сувязі з адзначаным вышэй выходзім у працэсе вывучэння методыкі выкладання літаратуры на такія мэты, як

**1)** мэты тэарэтычнага аспекту: **а)** планаванне настаўнікам паралельнай падрыхтоўчай працы да ўрокаў творчых работ у кантэксце вывучэння пытанняў, акрэсленых вучэбнай праграмай; **б)** этапы і формы працы настаўніка па здзяйсненні фактычных назіранняў над праграмнымі мастацкімі тэкстамі дзеля падрыхтоўкі навучэнцаў да напісання творчых работ і далейшага планавання і правядзення УТР; **в)** тэарэтычная падрыхтоўка навучэнцаў да выканання заданняў па напісанні творчай работы;

**2)** мэты практычнага аспекту: **а)** мадэляванне паводле структуры і зместу блокаў урокаў, часткай якіх з’яўляецца УТР і ўрокі па творах для дадатковага чытання (далей – УТДЧ)[3]; **б)** фарміраванне ў студэнтаў уменняў і навыкаў мадэлявання формы і зместу творчых работ на літаратурную і вольную тэму, іх праверкі і ацэнкі, аналізу сачыненняў і правядзення работы над памылкамі.

Рэалізацыя акрэсленых вышэй мэт можа здзяйсняцца ў кантэксце СПЛ наступным чынам. Засвоены матэрыял выкарыстоўваецца студэнтамі на далейшых этапах іх вучэбнай і прафесійнай дзейнасці:

---

[3] Асаблівасці, формы і змест рэалізацыі акрэсленых мэт у працэсе выкладання беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі акрэслены, напрыклад, у наступных працах аўтара дадзеных матэрыялаў: [1], [2], [3] і інш.

**а)** стварэнне навукова-метадычных праектаў па асаблівасцях падрыхтоўкі навучэнцаў да выканання творчых работ (курсавыя навуковыя даследаванні);

**б)** дапамога настаўніку ў падрыхтоўцы і правядзенні урокаў творчых работ, а таксама ў працэсе праверкі сачыненняў (педагагічныя практыкі);

**в)** планаванне, падрыхтоўка, правядзенне УТР (праца настаўніка);

**г)** мадэляванне сістэмы дамашніх заданняў і рэкамендацый па іх эфектыўным выкананні для навучэнцаў па асаблівасцях падрыхтоўкі творчых работ для пэўных этапаў літаратурнай адукацыі (праца настаўніка);

**д)** арганізацыя творчай дзейнасці навучэнцаў (конкурсы творчых работ і інш.; праца настаўніка).

Вызначым формы і змест самастойнай, аўдыторнай, практычнай дзейнасці студэнтаў у кантэксце рэалізацыі дадзенай тэмы і акрэсленай вышэй СПЛ і мэт па эфектыўнай яе рэалізацыі.

**1**. Распрацоўка апорных канспектаў адказу на пытанні семінарскіх заняткаў па тэме «Развіццё пісьмовага маўлення на ўроках літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі»: **а)** асаблівасці падрыхтоўкі навучэнцаў да выканання творчых работ і фарміравання навыкаў іх пісьмовага маўлення на ўроках літаратуры (метадычна-гістарычны аспекты); **б)** нарматыўныя і метадычныя дакументы аб асаблівасцях падрыхтоўкі навучэнцаў да выканання творчых работ і фарміравання навыкаў іх пісьмовага маўлення на ўроках літаратуры; **в)** асаблівасці планавання і падрыхтоўкі настаўнікам урокаў творчых работ па СПЛ; **г)** алгарытмы падрыхтоўкі навучэнцаў да выканання творчых работ па СПЛ; **д)** асаблівасці праверкі настаўнікам творчых работ і іх аналізу.

**2**. Калектыўная распрацоўка «Схемы планавання тэматыкі творчых работ, УТДЧ і УТР па беларускай літаратуры (базавы ўзровень, бягучы навучальны год): V–VI, VII–IX, X–XI класы».

Прыкладная структура схемы:

– клас;

– колькасць работ;

– патрабаванні вучэбных праграм да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў (у праекцыі на УТР);

– раздзел, тэма вучэбнай праграмы, вучэбнага дапаможніка ў межах якіх здзяйсняецца падрыхтоўка навучэнцаў да сачыненняў;

– прыкладныя віды сачыненняў;

– прапановы прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання (ПКТП): від творчай работы / тэма сачынення; для 2022 / 23 н.г. – *Рэкамендацыі па карэкціроўцы прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання ў 2022/2023 навучальным годзе па вучэбным прадмеце “Беларус-*

*кая літаратура" ў сувязі з неабходнасцю вылучэння асобных гадзін на напісанне навучальных і кантрольных сачыненняў*;

– УТДЧ (тэмы, абгрунтаванне выбару твораў у СПЛ);

– прапановы студэнтаў (тэматыка сачыненняў; сувязь тэм сачыненняў з тэматыкай раздзелаў і твораў, якія вывучаюцца, а таксама УТДЧ; асаблівасці перспектыўнай падрыхтоўкі навучэнцаў да напісання сачыненняў).

**3**. Калектыўная падрыхтоўка разгорнутых прэзентацый «Формы і змест метадычна-арганізацыйнай дзейнасці настаўніка па падрыхтоўцы УТДЧ і УТР» (у адпаведнасці з пазіцыямі прапанаванай вышэй «Схемы планавання тэматыкі творчых работ, УТДЧ і УТР па беларускай літаратуры (базавы ўзровень, бягучы навучальны год): V–VI, VII–IX, X–XI класы»). Выхад такіх прэзентацый у СПЛ: падрыхтоўка да курсавога і дзяржаўнага экзаменаў, навуковых даследаванняў, педагагічнай практыкі планаванне і правядзенне УТДЧ і УТР; падрыхтоўка практычных рэкамендацый для навучэнцаў па асаблівасцях паэтапнага стварэння тэкстаў творчых работ.

**4**. Абмеркаванне зместу і вынікаў працы студэнтаў па вызначаных вышэй напрамках іх метадычнай падрыхтоўкі на семінарскіх (практычных) занятках, а таксама ў перыяд педагагічных практык.

Праілюструем прыведзеныя вышэй тэарэтычныя зыходныя адной з прыкладных мадэляў яе выкарыстання (прапаноўваюцца студэнтам на лекцыйных занятках) у практычнай дзейнасці настаўніка (на прыкладзе V класа).

**I**. Тэмы першага сачынення прапаноўваюцца (урок 32, раздзел IV «Выразнасць мастацкага слова») на перспектыву падрыхтоўкі творчых работ у працэсе вывучэння IV раздзела (на выбар навучэнцаў: «Мой родны кут, як ты мне мілы!», «Прыродная прыгажосць, якую я бачу», «Мой любімы куточак прыроды»; від – пісьмовае навучальнае сачыненне з элементамі апісання на падставе ўласныхназіранняў за прыроднымі з'явамі).

**II**. Алгарытмы дзейнасці настаўніка ў кантэксце выхаду вучняў на СПЛ: **а)** аб'яўленне тэм сачыненняў, прыкладных іх планаў, зместу, этапаў і форм падрыхтоўкі; **б)** вызначэнне апераджальных (перспектыўных) заданняў да ўрока дадатковага чытання (№ 40) па творы У. Дубоўкі «Як сінячок да сонца лётаў», а таксама перыяду і асаблівасцей самастойнай працы з гэтым творам; **в)** вызначэнне патрабаванняў да творчых работ (аб'ём, выбар тэмы, структура сачынення, час і этапы яго падрыхтоўкі) і асаблівасцей іх зместу (выкарыстанне ўласных назіранняў, элементаў апісання, вобразнай сістэмы вывучаных твораў (урокі №№ 32–40) як прыкладу адлюстравання з'яў прыроды); **г)** падрабязнае (ужо падсумава-

нае ў адпаведнасці з папярэдне праведзенымі падрыхтоўчымі элементамі працы на ўроках №№ 32–40) тлумачэнне дамашняга задання па падрыхтоўцы першага пісьмовага варыянта сачынення; адбываецца ў пачатку урока па творы для дадатковага чытання (№ 40); **д)** вызначэнне матэрыялаў, ведаў, уменняў, якія былі назапашаны ў працэсе вучэння тэм па ўроках №№ 32–40, у праекцыі на падрыхтоўку першага варыянта сачынення (адбываецца пры падвядзенні тэарэтычных і практычных вынікаў у фінале ўрока (№ 40, УТДЧ).

**III**. Этапы падрыхтоўкі навучэнцаў да выканання творчай работы (мэтазгодна пастаянна і паслядоўна арыентаваць на гэтыя этапы і іх змест не толькі пяцікласнікаў, а і навучэнцаў VI–VII класаў з мэтай фарміравання ўстойлівай сістэмы ўстановак на падрыхтоўку і выкананне творчай работы).

Перспектыўны (выконваецца паступова з мэтай асэнсавання важнасці і неабходнасці падрыхтоўчага этапу для стварэння сачынення): **а)** папярэдні выбар тэмы сачынення ў працэсе чытання твораў (урокі №№ 32–35); паступовае (у адпаведнасці са зместам пытанняў, што вывучаюцца) абмеркаванне зместу і вобразаў сачыненняў; **б)** канчатковае вызначэнне тэмы, зместу і формы сачынення у час дамашняга чытання і асэнсавання (перыяд урокаў №№ 35–39) тэксту твора У. Дубоўкі «Як сінячок да сонца лётаў».

Непасрэдны: **а)** падрыхтоўка першага варыянта творчай работы (выконваецца як дамашняе заданне, атрыманае на ўроку № 40; настаўнік абавязкова павінен сфармуляваць патрабаванні да першага варыянта, на якія навучэнцы мусяць арыентавацца ў далейшым пры падрыхтоўцы іншых творчых работ); **б)** афармленне канчатковага варыянта сачынення пад кіраўніцтвам настаўніка на ўроку (№ 41) творчай работы.

У дадзеных матэрыялах прапанаваны парады, якія могуць поўнасцю ці часткова выкарыстоўвацца ў працэсе тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў, а таксама ў дзейнасці настаўнікаў беларускай літаратуры, скіраванай на фарміраванне ўменняў арганізацыі рацыянальнай, эфектыўнай, перспектыўнай працы навучэнцаў у працэсе падрыхтоўкі імі творчых работ.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Макарэвіч А. М.* Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах // Беларуская мова і літаратура. 2013. № 7. С. 9–16.

2. *Макарэвіч А. М.* Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах // Беларуская мова і літаратура. 2013. № 8. С. 21–30.

3. *Макарэвіч А. М.* Творы для пазакласнага чытання ў кантэксце сістэмы перспектыўных ліній пры вывучэнні беларускай літаратуры (сёмы клас) // Актуальные проблемы современной филологии и преподавания филологических дисциплин : сб. науч. статей Междунар. науч.-практич. конф., посвящ. 100-летию МГУ имени А. А. Кулешова, 15–16 мая 2013 г., г. Могилев ; МГУ имени А. А. Кулешова, 2013. С. 150–153.

4. Рэкамендацыі па карэкціроўцы прыкладнага каляндарна-тэматычнага планавання ў 2022/2023 навучальным годзе па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» ў сувязі з неабходнасцю вылучэння асобных гадзін на напісанне навучальных і кантрольных сачыненняў [Электронный ресурс]. URL: https://adu.by/images/2022/11/rek-ktp-bel-mova-sachynenne.pdf. (дата звароту: 05.12.2022).